УДК 947/987

# Пазыка-ашчадныя таварыствы ў Беларусі ў перыяд НЭПа

Доўнар Л. А.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пазыка-ашчадныя таварыствы былі адноўлены дэкрэтам Усерасійскага ЦВК ад 4 студзеня 1922 г. Гэтыя арганізацыі мелі права праводзіць укладныя, пазыковыя і гандлёва-пасрэдніцкія аперацыі, валодаць складамі для захоўвання тавараў, уступаць у карэспандэнскія адносіны з іншымі крэдытнымі арганізацыямі, кааператыўнымі, грамадскімі, урадавымі ўстановамі і прыватнымі асобамі, мецць уласныя органы друку. Першая такая ўстанова у БССР з'явілася ў Бабруйску ў ліпені 1923 г. Галоўнай умовай членства ў пазыка-ашчаднае таварыства было адпаведнае сацыяльнае паходжанне. Пазыка-ашчадныя таварыствы знаходзіліся пад пільным кантролем фінансавых органаў савецкай дзяржавы. Пастановай наркамфіна Беларусі ад 1 лістапада 1925 г. пазыка-ашчадныя таварыствы былі падзелены на два тыпы: саматужныя і сялянскія. Для саматужных таварыстваў былі створаны горшыя ўмовы існавання. У выніку саматужніку ці рамесніку трэба было заплаціць удвая большы паявы ўзнос, чым селяніну. Такія ўмовы не дазвалялі прыватным вытворцам укладваць атрыманыя сродкі ў аднаўленне асноўнага капіталу, пераважна на іх куплялі сыравіну. У перспектыве пазыка-ашчадныя таварыствы павінны былі перайсці да вытворчага кааперыравання ўсіх саматужнікаў і рамеснікаў. Тым не менш, выдатныя колькасныя паказчыкі былі сапсаваны значнымі якаснымі недахопамі. Па-першае, рост колькасці саматужных таварыстваў адбыўся за кошт узнікнення такіх устаноў у сельскай мясцовасці, а там не было эканамічных умоў для іх эфектыўнага функцыянавання. Па-другое, колькасць саматужнікаў і рамеснікаў у якасці пайшчыкаў таксама не адпавядала рэчаіснасці. У вёсках і мястэчках адзін чалавек часта рэгістраваўся ў двух саматужных, або адначасова ў саматужным і сялянскім пазыка-ашчадных таварыствах. Па-трэцяе, у пазыка-ашчадных таварыствах не была наладжаны сістэма кантролю за парадкам выдачы і выкарыстання крэдытаў. Можна зрабіць выснову, што паскорыць кааперыраванне прыватнай вытворчасці з дапамогай пазыка-ашчадных таварыстваў не ўдалося.

У канцы 1927 г. пачалося выцясненне прыватнай вытворчасці з эканомікі краіны. Для ўладальнікаў прыватных прадпрыемтваў было спынена крэдытаванне. У выніку роля прыватнай вытворчасці ў эканоміке краіны была амаль страчана.